# УПЛЫЎ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ ЗМЕНАЎ У ГРАМАДСТВЕ НА МАСТАЦКІ СВЕТ МОЛАДЗЕВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Кавалюк А.С.**

***УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”***

***Анатацыя.*** У артыкуле разглядаюцца станоўчы і адмоўны ўплыў сацыякультурных зменаў у грамадстве на якасць мастацкіх тэкстаў для моладзі, выяўляюцца аўтарскія прыёмы прыцягнення ўвагі чытача ва ўмовах зніжэння чытацкіх зацікаўленняў, мэтазгоднасць іх выкарыстання.

***Ключавыя словы:*** моладзь, каштоўнасныя прыярэтэты, ідэал, антыгерой, выхаваўчы патэнцыял.

Новая літаратурная сітуацыя, ў якой аказалася нацыянальнае мастацтва слова ў апошнія дзесяцігоддзі, дваяка адбілася на яго развіцці ўвогуле і на  літаратуры для моладзі ў прыватнасці. З аднаго боку, на хвалі сацыякультурных зменаў мастацтва слова вырвалася з абцугоў адзіна дазволенага ў савецкі час сацрэалізму, маладое пакаленне творцаў аказалася адкрытым як для традыцый нацыянальнай літаратуры, так і сусветнага мастацтва, у выніку чаго беларуская літаратура пачала абнаўляцца жанрава-стылёва (устаноўка на мікраформы, лірызацыяі, інш.) і праблемна-тэматычна (напрыклад, эратычная літаратура). З другога боку, гэтае абнаўленне часам пачало прыводзіць да зніжэння мастацкай якасці твораў і літаратура пачала страчваць свой выхаваўчы і фарміруючы патэнцыял.

Ва ўмовах зніжэння чытацкіх зацікаўленняў моладзі пісьменнікі вымушаны ўсяляк прыцягваць увагу чытача да сваіх твораў. Гэта адбываецца на “знешнім” узроўні – на ўзроўні жанравага вызначэння твора (Л. Рублеўская свайму раману “Забіць нягодніка, альбо Гульня

ў Альбарутэнію” дала жанравае вызначэнне раман-інструкцыя), на ўзроўні назвы твора (у дадзеным выпадку ўвагу чытача прыцягвае незразумелае слова Альбарутэнія). Кідкія назвы актыўна выкарыстоўвае В. Гапееў – аўтар шэрагу твораў, напісаных у серыі “Пераходны ўзрост”. Такую назву мае яго зборнік “Урокі першага кахання”, у які ўвайшлі аповесці з не менш прыцягальнымі назвамі: “Усё цудоўна, або Урок бяспечнага сексу”, “Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці”, “Першы боль, або Доказ закона прыгажосці”. У назвы твораў аўтарам, думаецца, наўмысна ўведзены катэгорыі, прыцягальныя для падлеткаў і юнакоў, – прыгажосць, каханне, сэкс. Апялюючы да іх, пісьменнік ускладвае на сябе велізарную адказнасць за тое, у якім ракурсе ён гэтыя катэгорыі прадставіць чытачу, як прапанаваная ім мастацкая канцэпцыя будзе ўплываць на светапогляд падрастаючага пакалення, якую мадэль міжасабовых і сацыяльных паводзінаў будзе фарміраваць. У рамане В. Гапеева “Праклён”, які карыстаўся папулярнасцю сярод студэнцкай моладзі, нягледзячы на тое, што не ўваходзіць у пералік праграмных твораў, шмат эратычных сцэн. У адной з іх жанчына ў ложку кахання пераўтвараецца ў пачвару. Эпізод як бы ўпісваецца ў мастацкі свет містычнага рамана, аднак, як і іншыя безразборлівыя сувязі, апісаныя ў творы, наўрад ці можа фарміраваць у чытача станоўчае ўяўленне аб інтымных адносінах. У жанравыя рамкі містычнага рамана як бы ўкладваецца і неаязычніцкая канцэпцыя аўтара. Аднак жа зноў узнікае пытанне: што яна павінна сфарміраваць у юнага чытача? Ці апраўданыя апісаныя ў творы чалавечыя ахвяры дзеля ўратавання паганскага крыжа? Тым больш, што пісьменнікам праводзіцца выразная паралель са старажытным ахвярапрынашэннем, калі ахвярай дзікунскага звычаю стала маладая цяжарная жанчына. Дзеля чаго актуалізуецца аўтарам самы змрочны

бок рэлігіі продкаў, калі ёсць хрысціянскі крыж і ён не патрабуе такога ахвярапрынашэння? Толькі адным з шэрагу сатанінскіх успрымаецца ў рамане дзейства, якое здзяйсняюць героі з абразом, адмаўляючыся ад Бога, каб уступіць у змаганне за кветку-папараць.

Павучальным для маладых у рамане В. Гапеева "Праклён" з'яўляецца, мабыць, толькі драматычны лёс галоўнага героя-студэнта, які, жадаючы разбагацець праз сацыяльныя сеткі, трапляе ў фінансавую пастку, становіцца рабом абставін, вымушаны здзейсніць забойства.

Арыгінальны па форме (раман – штрыхамі) і па праблематыцы, павучальны для маладых "Юргон" А. Казлова. Назва твора, дарэчы, таксама прыцягальная для чытача. Яго героем стаў сурочаны палюбоўніцамі маладзён, які, страціўшы мужчынскую сілу, губляе сэнс жыцця. Аўтарам псіхалагічна матывавана перададзены пачуцці і адчуванні героя, выяўлены яго ўнутраны свет. Жыццёвай філасофіі героя ("жыццё пачынаецца ноччу") адпавядае і яго імя. Праз роздумы-разважанні Юргона наконт таго, каторая з яго каханак адпомсціла за пакінутасць, пісьменнікам закранаецца праблема адказнасці чалавека за свае ўчынкі, адказнасці старэйшага пакалення за гендарнае выхаванне моладзі (ахвяруючы пляменніку кватэру, дзядзька блаславуляе яго на распуснае жыццё). Правёўшы свайго героя па пакутах, аўтар быццам бы імкнуўся накіраваць яго на духоўны шлях праз зварот у скрушнай сітуацыі да Бога і Боскага (выкарыстанне святой вады). Аднак гэтага не адбываецца, паколькі зварот гэты фармальны, на ўзроўні абраду, герой не прыходзіць да пакаяння, разумення сваёй грахоўнасці ў прэлюбадзействе.

Мастацкай асаблівасцю рамана "Юргон" А. Казлова з'яўляецца ўвядзенне ў твор элементаў міфалагізацыі (вобразы Духу бяссілля, чараўніка Чорнага Гардзея, змяі Катрынкі). Праз іх пісьменніку

ўдалося перадаць чалавечае імкненне падпарадкоўваць сабе іншага, помсціць, выкарыстоўваючы чарадзейства, і паказаць фізічны стан і адчуванні ахвяры гэтых маніпуляцый. У антыгероя А. Казлова юныя чытачы могуць павучыцца, як не патрэбна паводзіць сябе ў жыцці.

Ідэалам героя для сучаснай моладзі можа стаць постаць гістарычнай асобы сусветнага маштабу з рамана Я. Конева "Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі". Аўтару ўдалося свайго героя паказаць не толькі таленавітым прафесіяналам, знаўцам сваёй справы, але і духоўна багатай асобай, якая, нягледзячы на шматлікія жыццёвыя выпрабаванні, жыве ў гармоніі са светам, умее наладжваць міжасабовыя зносіны і займаецца парадкаваннем сваёй душы.

У скрушныя і радасныя моманты свайго жыцця Тадэвуш уздымае вочы ў зорнае неба, адчувае Божую благадаць, якая струменіць адтуль: "*Зоры струменілі праз чорную заслону райскае святло. Касцюшка пазіраў у зіхатлівую вышыню і думаў: збудаваў ён Вест-Пойнт – збудуе і Храм у сваёй душы! І паспрабуе ўдасканаліць жыццё вакол сябе*" [1, с. 268]. За ўсё ў сваім пакручастым лёсе Касцюшка удзячны Усявышняму. Перакананы сам, ён пераконвае і іншых, што "*не варта скардзіцца на лёс, удача можа прыспець у любы момант*" [1, с. 205]. Фраза "*Мы не маем улады над сваім лёсам*", укладзеная ў вусны Касцюшкі, пяць разоў паўтараецца ў творы. "*Лёс навучыў мяне цярплівасці,* – прызнаецца герой. – *Варункі жыцця – за межамі нашага розуму. Мы толькі пазней спасцігаем, што выпрабаванні пасылаліся нам нездарма. Дык варта не азлабляцца, не кідаць выклік наканаванню, а набрацца цярплівасці і памятаць – мы не маем улады над сваім лёсам*" [1, с. 250]. Параўноўваючы розныя філасофскія вучэнні, Касцюшка імкнуўся зразумець Боскую мудрасць.

Сімвалічным у рамане з'яўляецца вобраз арла з распрасцёртымі крыламі на сыгнеце, падораным каханай. На яго раўняецца свабодалюбівы Тадэвуш, не скораны нягодамі, душа яго ўжо ляціць да райскага святла. Свайго героя пісьменнік надзяліў моцным пачуццём ліцвінскага патрыятызму. Пры любой нагодзе Касцюшка з гонарам падкрэслівае, што ён ліцвін. Па-скарынінску гучыць адказ Тадэвуша на запрашэнне пусціць у Амерыцы карані: "*Я не прыжывуся тут. Мае карані – на Бацькаўшчыне. Рыбіна плыве на нераст праз тысячы водаў у сваё мора, сваё логвішча. Птушка ляціць праз кантыненты ў сваё гняздо. Гэтаксама і я – не пражыву доўга без свайго мора, без свайго гнязда. Паплыву, палячу. Нішто мяне не ўтрымае*" [1, с. 299]. Апошні радок рамана: "*Арол вяртаўся ў сваё гняздо*" [1, с. 302]. Я. Конеў выявіў майстэрства раскрыцця ўнутранага свету герояў. Яго твор здольны фарміраваць лепшае ў чалавеку, у тым ліку і культуру інтымных зносінаў.

Мастацкая літаратура ва ўсе часы, з'яўляючыся адлюстраваннем жыцця грамадства, адгукалася на яго запатрабаванні. Нягледзячы на змену чалавецтвам каштоўнасных прыярэтэтаў, мастацтва слова павінна заставацца важнейшым сродкам фарміравання светапогляду асобы, яе маральна-этычных паводзінаў і духоўнага свету. Калі гаворка ідзе пра моладзевую літаратуру, гэтая фарміруючая функцыя слоўнага мастацтва набывае яшчэ большую актуальнасць.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Конеў, Я. Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі / Я. Конеў. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 302 с.